# ВУЧОБУ Ў ЦЭНТР УВАГІ БЮРО

У Генадзія Ламца, як і у кожнага студэнта, свае турботы. Уявіце сабе, што ён у гэтым семестры не здау яшчэ ніводнага знака па замежнай мове.

Былі-б турботамі адны толькі «тысячы». А тут яшчэ непрыемнасць. «І чаму лес такі бязлітасны?» Трэба-ж было дапусціць Генадзію у сваю заліковую кніжку такую нечаканую госцю, як «двойка» па тэарэтычнай фізіцы. З-за яе прышлося чырванець перад таварышамі на групавым комсамольскім сходзе у пачатку семестра. «Што ён думае рабіць далей, як будзе вучыцца у другім семестры?»,—спыталі у Генадзія. Канкрэтнага ён нічога не змог адказаць. Ды хіба гэта упершыню?

У першай групе неяк звыкліся бачыць Генадзія адстаючым. Ніхто не здзіуляецца, калі ён атрымлівае на экзаменах і пасрэдныя адзнакі. І хлопец здольны, са срэбраным медалем ва універсітэт прыйшоу, а вось павялося так, што ён амаль кожную сесію «завальвае».

«Такім ён, відаць, урадзіуся». Гэтакай думкі прытрымліваецца нават комсорг Аркадзій Яльніцкі. Калі мы запыталіся у яго аб прычынах такого погляду, той не задумваючыся адказау:

— Колькі мы з Генадзіем не гаварылі, ён усё той-жа. Дае слова справіцца, а потым па-ранейшаму вядзе сябе.

Адчувалася—комсорг ведае, што робіцца у групах, але па-сапраўднаму ацэньваць становішча не можа. У групе 22 комсамольцы, трое з іх атрымалі на экзаменах у апошнюю сесію дрэнныя адзнакі. І гэта не было нечаканасцю.

— Ад іх можна было чакаць,—сказау нам Аркадзій аб «двоечніках».

Адкуль такая самаупэуненасць у комсорга, чаму ён нічога не можа зрабіць, каб выправіць справу? І не з адным Генадзіем трэба было папрацаваць комсамольскай групе і комсоргу. У апошнюю сесію абодва экзамены здау на «двойку» Яугені Астрамецкі.

І Генадзій і Яугені не адзінокія на курсе.

12 чалавек на трэцім курсе хімічнага факультэта атрымалі ў мінулую сесію дрэнныя адзнакі. А тых, хто задаволіуся пасрэднымі, утрая больш. Такое становішча здавалася-б, павінна чаму-небудзь навучыць комсамольскае бюро курса (сакратар Зінаіда Цюрына). Яна спасылаецца на павышаныя патрабаванні. Але-ж гэтыя патрабаванні не былі чамусьці звышнатуральным для астатніх студэнтау III курса хімфака. 8 чалавек здалі сесію на «выдатна». Ці не варта павучыцца у іх?

Комсамольская арганізацыя курса шматлікая. Ёсць у яе усе магчымасці ажывіць работу на курсе, палепшыць пасяпяховасць студэнтау.

Нельга сказаць, што бюро курса не працуе. Адказныя за палітмасавую работу Людміла Эльзмановіч і Барыс Пазняк—адказны за культурна-масавую работу, робяць усё магчымае, каб комсамольская работа на курсе была кроунай справай кожнага студэнта. За акадэмічны сектар тут адказваюць усе, гаворыць Зінаіда Цюрына. А атрымоуваецца на справе, што комасмольскае бюро з-за пабочных пытанняу не бачыць галоунага, чым яно павінна займацца.

— У нас на курсе пытаннямі вучобы займаюцца комсоргі груп,—заяуляе Зінаіда Цюрына. А як комсоргі працуюць над пытаннямі павышэння пасяпяховасці студэнтау, мы бачылі на прыкладзе першай групы. Вера Сачык і Ларыса Казок з другой групы, атрымаушыя па «двойцы» у зімовую сесію, таксама лічацца заусёды адстаючымі. Бюро курса раздзяляе погляды студэнтау, што Вера і Ларыса не выйдуць на правільны шлях і не будуць вучыцца лепш, чым раней.

Студэнты, якія лічацца «адстаючымі», не вельмі гладка займаліся у гэтым семестры. Таварышы з бюро разводзяць рукамі: што мауляу, мы можам зрабіць, калі яны з першага курса цягнуцца у «хвасце»? А ці многа зрабіла бюро, каб павысіць пасяпяховасць адстаючых студэнтау? Зінаіда Цюрына можа толькі назваць сход перад мінулай сесіяй, на якім размова ішла аб экзаменах, ды сходы у групах пасля сесіі. Гэтым і абмежавалася работа курсавога бюро і комсоргау груп. Дзе-ж ініцыятыва бюро, дзе тая атмасфера нецярпімасці, разам з тым дапамога адстаючым? Чаму-б выдатнікам не узяць шэфства над астдаючымі, дапамагаць і кантраляваць іх работу? Выклікае здзіуленне, што члены камітэта комсамола універсітэта да гэтага часу не пацікавіліся работай бюро III курса.

А варта-б было больш уважліва прыглядзіцца да тых, хто кожную сесію атрымлівае нездавальняючыя адзнакі.

**Н. КРЭМЕНЬ.**

# РАДЫЁВУЗЕЛ БДУ... НЕ ГАВОРЫЦЬ

*«Три года, как родился,*
*А ни слова не сказал,—*
*Так вызначыу «Авадзень» работу універсітэцкага радыёкамітэта у адным з апошніх нумарау 1956 года.*

*Аднак, ужо у пачатку гэтага года Рубікон астауся ззаду. Раз у нядзелю студэнты, пражываючыя у інтэрнаце па Бабруйскай вуліцы, мелі магчымасць слухаць па радыё рознастайныя перадачы аб жыцці універсітэта.*

*І усё-ж некаторыя дасужыя жартаунікі глыбокадумна заяўляюць, што універсітэцкі радыёкамітэт—«дзіця недаразвітае». У некаторай меры яны гавораць праўду.*

*Хто-ж у гэтым вінаваты? У падобных выпадках прынята гаварыць, што вінаваты бацькі. А гэта значыць—грамадскасць універсітэта. Радыёкамітэт-жа—яе кроунае дзецішча!*

*А што атрымліваецца ў нас? Партком і камітэт комсамола вылучылі для работы «на радыё» спецыяльных людзей. Але што могуць зрабіць 5—7 чалавек, калі яны не знаходзяць сабе належнай падтрымкі з боку большасці студэнтау?*

*Прывяду прыклад. Для фестывальнага радыёвыпуска мы намячалі запісаць на магнітафон некалькі нумарау мастацкай самадзейнасці геафака. Нашы карэспандэнты дамовіліся з адказным за культмасавую работу факультэта Вішнеускім аб сустрэчы са студэнтамі. Нажаль, спатканне не адбылося. Відаць, удзельнікі мастацкай самадзейнасці геафака проста паскромнічалі: на іншых факультэтах самадзейнасць не горш—сходзіце лепш туды.*

*Гэта адзін бок справы, унешні. Не лепш абстаяць справы з другім, унутраным. Я маю на увазе тэхнічнае абсталяванне радыёвузла. У нас няма нават праігрывацеля, не гаворачы ужо аб пераносным магнітафоне, запасе пласцінак, плёнак і інш. Неабходна мяняць узмацняльнік радыёвузла, які даўно ужо адказвае у рабоце.*

*Зараз-жа радыёвузел зусім маучыць.*

*Праўда, бухгалтэрыя абяцае фінансаваць некаторыя пакупкі. Нам, прызнацца, прыемней было-б атрымаць не абяцанні, а грошы.*

*Мы спадзяемся, што грамадскасць універсітэта зробіць з вышэй—сказанага належныя вывады і дапаможа нам наладзіць нармальную работу радыёвузла.*

*І. РУДАМЕТАЎ,*
*рэдактар аддзела музычнага вяшчання радыёкамітэта БДУ.*

## ДА 40-ГОДДЗЯ КАСТРЫЧНІКА

# ЛЕКЦЫІ І ДАКЛАДЫ

Актыуны удзел у падрыхтоуцы святкавання 40-годдзя Вялікай Кастрычніцкай Соцыялістычнай рэволюці прымаюць выкладчыкі нашашага універсітэта. Яны выступаюць з лекцыямі і дакладамі, прысвечанымі гэтай знамянальнай даце перад працоунымі горада і раёна.

Комуніст Г. С. Маханёк прачытау даклад рабочым і інжэнерна-тэхнічным работнікам аутамабільнага завода на тэму: «Партыя большэвікоу—арганізатар і кіраунік Кастрычніцкага узброенага паустання».

Перад настаунікамі Фрунзенскага раёна г. Мінска выступіу Г. І. Якуб, О. Г. Ражкоу выяз джау з дакладам у горад Маладзечна.

«Што дала Кастрычніцкая Соцыялістычная рэволюцыя моладзі»—так называецца даклад, прачытаны Н. П. Хрыпко на аутазаводзе.

Гутаркі правялі таксама М. П. Баранава, Н. С. Шавельская, В. І. Мартавіцкі і іншыя.

**Л. КУЗІН.**

## ПАДРЫХТОЎКА КАНФЕРЭНЦЫЙ

Да 40-годдзя Вялікай Кастрычніцкай Соцыялістычнай рэволюцыі у БДУ рыхтуюцца навуковыя сесіі, на якіх з дакладамі выступяць выкладчыкі і студэнты універсітэта.

В. А. Рабцэвіч распрацоувае пытанні, звязаныя з кастрычніцкімі падзеямі на Беларусі.

Аб росквіце соцыялістычнай культуры беларускага народа за гады совецкай улады раскажа у сваім выступленні Н. С. Шавельская.

У канферэнцыі прымуць удзел выкладчыкі і студэнты усіх факультэтау.

**М. МАЗОН.**

## ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

# У сетцы партасветы

У гэтым навучальным годзе на юрыдычным факультэце пачау сваю работу семінар па вывучэнню асобных пытанняу палітэканоміі (кіраунік—кандыдат эканамічных навук П. У. Грышановіч).

Спачатку усе выкладчыкі юрфака рашылі самайстойна вывучаць марксісцка-ленінскую тэорыю. Аднак вопыт такога вывучэння паказау, што перыядычная сустрэчы вельмі карысныя.

Субяседванні адбываліся два разы у месяц, праходзілі у форме таварысцкай гутаркі. Тэматыка заняткау і круг пытанняу, якія абмяркоуваліся на семінарах, устанауліваліся з улікам пажаданняу саміх удзельнікау семінара. Гэтым і тлумачыцца тое, што заняткі праходзілі жыва і цікава. Выкладчыкі і аспіранты ставілі на абмеркаванне няясныя для іх пытанні, абменьваліся думкамі па спрэчных пытаннях.

Адсутнасць фармалізма у правядзенні занятка у, улік пажаданняу членау гуртка, добрая падрыхтоука забяспечылі высокую актыунасць у абмеркаванні пытанняу.

Асабліва актыуны удзел у рабоце семінара прымалі кандыдаты юрыдычных навук І. І. Марціновіч, С. Р. Віхарау, І. А. Юхо, лабаранты Дрэкалава, Чэрнабай і іншыя.

27 мая адбылося выніковае пасяджэнне семінара. Быу абмеркаван даклад Н. С. Хрушчова «Аб далейшым удасканаленні арганізацыі кіравання прамысловасцю і будаунцтвам». Змястоунымі былі выступленні В. А. Матусевіча, С. Р. Віхарава і іншых таварышоу.

Удзельнікі семінара падвялі вынік сваей работы у гэтым годзе. Усе аднадушна адзначылі, што семінар прынёс ім вялікую карысць, дапамог глыбей засвоіць і вывучыць матэрыялы апошніх сесій Вярхоунага Совета СССР.

Вырашана у будучым навучальным годзе аднавіць работу семінара, значна пашырыушы яго састау.

**І. С. ЦІШКЕВІЧ.**

☆ ☆ ☆

У склад слухачоу гуртка бягучай палітыкі работнікау інтэрната (корпус «А») уваходзіць 16 чалавек. Заняткі праводзіліся адзін раз у тыдзень. На кожным з іх было 10—13 чалавек.

У тэматыку гутарак уключаліся асноуныя дакументы партыі і урада (Закон аб дзяржаўных пенсіях, Пастанова снежаньскага і лютаускага Пленумау ЦК КПСС, матэрыялы VII сесіі Вярхоунага Совета СССР, даклад Н. С. Хрушчова «Аб далейшым удасканаленні арганізацыі кіравання прамысловасцю і будаунцтвам» і іншыя).

Слухачы вельмі цікавіліся падзеямі у краіне і за мяжой, высвятлялі няясныя пытанні.

27 мая адбыліся выніковыя заняткі. На жаль, на іх не было прадстауніка ад парткома БДУ. І наогул, на працягу вучэбнага года на занятках толькі адзін раз прысутнічала адказная за гэты участак работы ад партбюро адміністратыуна-гаспадарчай часткі Е. Б. Карабутава.

**Т. АНІСІМАВА,**
**кіраунік гуртка.**

Вясна гэтага года была надзвычай «урадлівай» для нашых універсітэцкіх паэтау і пісьменнікаў. У часопісе «Полымя» змешчаны падборкі вершау Юрася Свірко і Рыгора Барадуліна. У часопісах і газетах паявіліся апавяданні Васіля Ніколаенкі, Вячэслава Адамчыка, Віктара Карамазава.

*НА ЗДЫМКУ: Генадзій Бурайкін, вярнуушыся з рэспубліканскай нарады маладых паэтау, расказвае сябрам аб сваіх уражаннях.*



СЯМЁН БЛАТУН

## ПЕРАД СПАТКАННЕМ

*Гарнітур адгладжаны, і боты,*
*Як люстэрка, свецяцца, гараць.*
*І сябры жадаюць мне ахвотна*
*«Ну, Сямён, ні пуха, ні пяра»!*

*«К чорту», хлопцы, — гавару з усмешкай,*
*Папрауляю гальштук на хаду...*
*Мне трамвай не трэба, сёння пешшу*
*Я вячэрнім горадам пайду.*

*І пайду, як з песняю харошай,*
*З думкай светлай аб адной табе.*
*Мо' таму сягоння так прыгожа*
*Расквітнеуся ў скверы сіні бэз.*

*Мо' таму так ціха вее вецер,*
*Каб спатканне наша не сарваць,*
*Мо' то ліпы маладжавым веццем*
*Шэпчуць мне: «ні пуха, ні пяра».*

### ПА СЛЯДАХ НАШЫХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ

# „ЗВЯРНІЦЕ ЎВАГУ!"

У № 13 нашай газеты быў змешчан матэрыял «Звярніце увагу!», у якім крытыкаваліся паводзіны групы студэнтаў II курса філалагічнага факультэта аддзяленняу рускай мовы і літаратуры і журналістыкі.

Намеснік дэкана філалагічнага факультэта Г. В. Булацкі паведаміў рэдакцыі, што студэнты Праваловіч, Карпачоу, Сініцкі, Маслоуская, Чэчко, Сямёнава, Ляуданская, Сакалова, Шчасновіч, Кляеуская і Сінякова, аб якіх ідзе гутарка у артыкуле, атрымалі вымову. Комсамольскай групе II курса аддзялення рускай мовы і літаратуры прапанавапа правесці комсамольскі сход, на якім абмеркаваць паводзіны вышэй названых студэнтау гэтага аддзялення.

Дэканат паведаміў, што для лепшага засваення матэрыялу па курсу гісторыі КПСС у новым навучальным годзе студэнты аддзяленняў рускай мовы і літаратуры і журналістыкі будуць разбіты на дзве групы.

Рэдактар А. ВОЛК.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, Біякорпус, 62, тэл. 2-07-19
АТ 01506 Друкарня выдавецтва БДУ. Зак. 589 Тыраж 2000